# *§ 10–0. Рэлігія ў жыцці сярэдневяковых грамадстваў

**1. Царкоўная арганізацыя.** На працягу I–IV стст. хрысціянства прайшло шлях ад невялікай групы паслядоўнікаў да пануючай рэлігіі ў Рымскай імперыі. Гэты перыяд характарызуецца не толькі распаўсюджаннем веры, але і фарміраваннем першых структур царкоўнай арганізацыі, якія заклалі падмурак для будучага развіцця хрысціянства ў Еўропе.

З'яўляецца духавенства як асаблівы сацыяльны пласт — клір, з якога вылучаецца епіскапат. З III ст. у хрысціянскія абшчыны пацягнуліся выхадцы са знаці і дзяржаўнай адміністрацыі. Яны ствараюць новую адміністрацыйную надбудову ў выглядзе інстытута мітрапалітаў.

Пасля легалізацыі хрысціянства (у 313 г. імператар Канстанцін Вялікі выдаў Міланскі эдыкт) пачалося актыўнае фарміраванне царкоўнай іерархіі. Папа Рымскі робіцца цэнтральнай постаццю, а біскупы атрымліваюць значныя паўнамоцтвы ў кіраванні мясцовымі абшчынамі. Важнымі падзеямі сталі саборы, на якіх абмяркоўваліся ключавыя пытанні веравучэння і царкоўнай дысцыпліны. Велізарную ролю ў вызначэнні асноў хрысціянскай дактрыны і ўмацаванні адзінства царквы адыграў першы Нікейскі сабор, які адбыўся ў 325 г.

Адным з найважнейшых аспектаў фарміравання царкоўнай арганізацыі было стварэнне *кананічнага права* — зводу нормаў і правілаў, якія рэгулявалі жыццё царквы. Гэтае права паспрыяла стандартызацыі веравучэння і практыкі, а таксама ўмацаванню ўлады біскупаў.

Як вядома, галоўнай крыніцай веры для хрысціян з'яўляецца Святое Пісанне — збор боганатхнёных кніг. У IV ст. на Усходзе Іаан Златавуст і св. Епіфаній Кіпрскі

1. Чалавека, занятага разумовай працай, у Сярэднія вякі называлі «доктар», «магістр», «прафесар». Ці можна да гэтага спіса інтэлектуалаў дадаць клірыкаў?
2. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, выявіце гістарычныя падставы для з'яўлення дакумента пра так званы «дарунак Канстанціна». Як вы лічыце, чаму ўзнік такі міф?

назвалі гэтыя зборы свяшчэнных кніг Бібліяй. Кананізацыя біблейскіх кніг зрабілася прадметам спрэчак і праводзілася доўгі час.

У Рымскай імперыі галоўнымі кіраўнікамі царквы з'яўляліся пяць патрыярхаў (з грэч. — «айцец», «старэйшына»), якія жылі ў розных рэгіёнах імперыі: Канстанцінопалі, Рыме, Александрыі, Антыёхіі і Ерусаліме. Уплыў рымскага патрыярха ў царкве з цягам часу ўзмацняўся. Для апраўдання прэтэнзій пап на свецкую ўладу і новых патрабаванняў панавання ў хрысціянскім свеце патрэбна было абгрунтаванне. У выніку ўзнік дакумент аб так званым «дарунку Канстанціна», несапраўднасць якога была даказана толькі ў XV ст. У ім рымскі імператар Канстанцін Вялікі быццам бы завяшчаў рымскаму пáпу Сільвестру ўладу над заходняй часткай Рымскай імперыі. Гэта было зроблена ў кантэксце супрацьстаяння з Візантыйскай царквой.

Такім чынам, з невялікіх абшчын хрысціянства ператварылася ў магутную арганізацыю з акрэсленай іерархіяй і ўсталяванымі нормамі. Гэтыя змены не толькі спрыялі ўмацаванню веры, але і заклалі падмурак для далейшага развіцця хрысціянскай царквы на працягу стагоддзяў. Структура, што склалася, аказала велізарны ўплыў на грамадскае жыццё Еўропы і зрабіла хрысціянства адной з галоўных сіл, якія фарміравалі культуру і цывілізацыю кантынента.

**2. Становішча царквы ў Візантыі.** Да сярэдзіны XI ст. хрысціянская царква лічылася адзінай. Але фактычна яна падзялілася на ўсходнюю і заходнюю яшчэ тады, калі Рымская імперыя распалася на дзве часткі.

У праваслаўі вера насіла больш індывідуальны характар, што мела прычынай большую цэнтралізацыю ўлады ў тагачаснай Візантыі, больш індывіду-

алізм візантыйцаў перад абліччам дзяржавы, калі ўратаванне рабілася асабістым клопатам чалавека, а не калектыўным, як на карпаратыўным Захадзе.

Каталіцкая царква адлюстроўвала ў сваёй унутранай будове манархічны лад, цвёрдую цэнтралізацыю і іерархічную структуру, заснаваную на царкоўнай уласнасці на зямлю. У адрозненне ад яе праваслаўная царква ў Візантыі існавала ў межах цэнтралізаванай дзяржавы, не была носьбітам ідэі пераваґі царкоўнай улады над свецкай, а, наадварот, прапаведавала неабходнасць злучэння царквы і дзяржавы.

Заходнія біскупы былі сапраўднымі феадальнымі ўладарамі: буйны́мі землеўладальнікамі, адміністратарамі, нават узначальвалі вайсковыя часці. Іх візантыйскія калегі жылі пераважна за кошт шчодрасці імператара і наогул уладаў. Візантыйская традыцыя, якая каранілася ў праваслаўі, не толькі спрыяла ўмацаванню адной галіны ўлады — манархіі, але і прывяла да драблення саміх праваслаўных абшчын, у выніку чаго паўсталі асобныя самастойныя цэрквы: Грэчаская, Балгарская, Грузінская, Руская і іншыя.

Складзіце параўнальную табліцу «Становішча царквы ў Візантыі і ў праваслаўным свеце». Крытэрыі для параўнання (не менш за тры) распрацуйце самастойна. Зрабіце вывад.

**3. Узмацненне ролі папства.** Пантыфікат Інакенція III — час найбольшай магутнасці папства. Усю ўвагу ён засяродзіў на ажыццяўленні сваёй тэакратычнай дактрыны. Яна зводзілася да таго, што папская ўлада — найвышэйшая ўлада ва ўсім свеце; папа як пераемнік апостала Пятра і намеснік Хрыста вышэйшы за ўсіх гасудароў; імператар і іншыя каралі — толькі яго васалы. Ён ладзіў крыжовыя паходы супраць ерэтыкоў на поўдні Францыі, быў ініцыятарам IV крыжовага паходу. Умеў ён і рабіць грошы, атрымліваючы іх ад збораў на крыжовыя паходы, у выглядзе васальных плацяжоў ад залежных краін, продажу індульгенцый, чаканкі ўласнай манеты — дэнарыя св. Пятра.



*Інакенцій III. 1219 г.*

1. Як папства выкарыстоўвала крыжовыя паходы для ўмацавання сваёй улады?
2. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, складзіце храналогію асноўных падзей, звязаных з узмацненнем улады папства пачынаючы з IX ст. да XV ст.

У XIII ст. быў усталяваны сучасны парадак выбараў папаў. Ужо ў наступным, XIV ст. становішча папства пачынае істотна мяняцца ў выніку сутыкнення яго інтарэсаў з інтарэсамі каралеўскай улады ў Еўропе.

**4. Духоўна-рыцарскія ордэны.** Мясцовае насельніцтва ў Палесціне, натуральна, ставілася да крыжакоў варожа. Пад камандай іерусалімскага караля было ўсяго каля 2 тыс. рыцараў і каля 10 тыс. сяржантаў з гараджан і залежнага насельніцтва манастыроў. Прытым разам яны ніколі не збіраліся. Таму для абароны сваіх уладанняў заваёўнікі стварылі пастаянныя вайсковыя арганізацыі — так званыя духоўна-рыцарскія ордэны. Першы сярод іх быў ордэн тампліераў (храмоўнікаў), створаны ў 1119 г. двума сябрамі — рыцарамі з Бургундыі і Фландрыі. Ордэн гаспітальераў (іаанітаў), заснаваны раней, ад пачатку абмяжоўваў сваю дзейнасць дапамогай параненым і хворым і толькі пасля зрабіўся рыцарскім і набыў ваенныя функцыі. Яго заснаваў багаты італьянскі купец. Каля 1070 г. ён пабудаваў каля брамы манастыра Святой Марыі Лацінскай, што пад Іерусалімам, дом для паломнікаў — на лаціне «гаспіталіс», што значыла «пакоі для гасцей». У гэтай «гасцініцы» прымалі стомленых і хворых паломнікаў, атулялі іх клопатам і доглядам. Пры гэтым доме з'яўляліся манахі і манахіні, якія ператвараліся ў братоў і сясцёр міласэрнасці.

У 1128 г. у Іерусаліме быў створаны Тэўтонскі ордэн. У 1189 г. сын імператара Фрыдрыха I Барбаросы надаў ордэну ваенны характар, а ў 1196 г. яго зацвердзіў папа.

Статуты створаных ордэнаў былі спецыфічныя: іх сябры, застаючыся рыцарамі, прымалі ўсе манаскія абяцанні (бясшлюбнасці, паслушэнства і г. д.). Але галоўным іх заняткам была вайна. Ордэны былі санкцыянаваныя пáпамі і падпарадкоўваліся непасрэдна

ім. Створаныя некалькімі энтузіястамі, якія добраахвотна займаліся абаронай паломнікаў і доглядам хворых, духоўна-рыцарскія ордэны хутка разрасталіся, у тым ліку і таму, што смерць у баі за Хрыстову справу лічылася прамым шляхам у рай. Ордэнам былі перададзены зямельныя ўладанні з сялянамі, што жылі на іх, для задавальнення матэрыяльных патрэб. Першапачаткова гэта былі землі на Усходзе, а пасля і ў Еўропе. Ваенная здабыча ордэнаў таксама заставалася за імі. Ва ўмовах феадальнай раздробленасці духоўна-рыцарскія ордэны, звязаныя суровай дысцыплінай, уяўлялі ў той час значную ваенную сілу.

Пасля выціскання крыжакоў з Усходу духоўна-рыцарскія ордэны перанеслі сваю дзейнасць у Еўропу. Паколькі ў іх ваенных паслугах там патрэбы не было, манахі-воіны знаходзілі сябе ў розных галінах. Асноўная маса тампліераў асела ў Францыі, дзе яны актыўна заняліся крэдытаваннем і стварылі праобраз банкаўскай сеткі ў Еўропе. Перамясціўшыся ў Францыю з назапашанымі рэсурсамі, тампліеры ўблыталіся ў канфлікт з французскім каралём, што прывяло да ліквідацыі ордэна ў пачатку XIV ст.

Гаспітальеры апроч клопату пра хворых паломнікаў і ваеннай службы заняліся вырабам цукру, які ў той час быў адным з найбольш прыбытковых тавараў. Яго экспартавалі не толькі ў сумежныя Венецыю, Геную, Канстанцінопаль, але і шмат у якія гарады Заходняй Еўропы. Яшчэ ў гаспітальераў добра атрымліваўся выраб дэфіцытнага тады ў Еўропе мыла. Яны будавалі і ўзорныя крэпасці, а таксама вялікія, абабітыя бранёй галеры. Пасля выгнання з Палесціны іааніты спачатку авалодалі Крытам, затым — Родасам, адкуль былі выгнаны ў 1522 г. туркамі. З дазволу германскага імператара Карла V яны пасяліліся на Мальце, дзе ў 1530 г. пераўтварыліся ў Мальтыйскі ордэн.

1. Растлумачце, чым манаскія ордэны адрозніваліся ад духоўна-рыцарскіх.
2. Параўнайце духоўна-рыцарскія ордэны. Чым яны адрозніваліся і што іх аб'ядноўвала?

Тэўтонскі ордэн апынуўся ў германскіх землях. Тут ён знаходзіўся ў бядотным становішчы, пакуль у сярэдзіне XIII ст. не пачаў дапамагаць польскаму князю Конраду Мазавецкаму ў барацьбе з прускімі язычнікамі. Далейшая гісторыя гэтага ордэна звязаная з гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага, чые ўзаемаадносіны з дзяржаваю крыжакоў уяўлялі сабой трывалыя эканамічныя, рэлігійныя, культурныя сувязі, якія раз-пораз перапыняліся крывавымі войнамі і дыпламатычнымі канфліктамі.

**5. Роля хрысціянства ў станаўленні сярэднявяковай еўрапейскай культуры.** Ва ўмовах варварызацыі Заходняй Еўропы царква ператварылася ў адзінага захавальніка антычнай спадчыны. Здаралася, што манастыры былі адзінымі месцамі, дзе захоўваліся старажытныя рукапісы. Шмат для іх захавання зрабіў рымскі арыстакрат Флавій Магн Аўрэлій Касіядор (каля 490–585), які намагаўся адстойваць рымскія ідэі на службе ў гоцкага караля Тэадорыха. Паколькі ва ўмовах усеагульнай разрухі адзінымі месцамі, у якіх збіраліся адукаваныя людзі, былі манастыры, Касіядор заснаваў на ўласныя сродкі ў Калабрыі (Паўднёвая Італія) Віварый — манастыр і вучоную абіцель, дзе манаская брацція мусіла вывучаць і перапісваць кнігі. Касіядор быў прыхільнікам замірэння рымлян з варварамі. Ён напісаў некалькі наказаў, каб дапамагчы манахам арыентавацца ў свеце кніг: «Навучанне ў боскім чытанні», «Навучанне ў свецкім чытанні», «Аб арфаграфіі». Дзейнасць Касіядора і яго вучняў паклала пачатак манастырскім *скрыпторыям* — спецыяльным пакоям для перапісвання рукапісаў. У XII ст. скрыпторыі былі ўжо ў 2000 манастыроў. Так было захавана шмат кніг антычных аўтараў, а падручнікі Касіядора лічыліся неабходнымі для адукаванага чалавека аж да XIII ст.



*Флавій Магн Аўрэлій Касіядор. Мініяцюра. 1170-я гг.*

Значную ролю адыграла царква ў развіцці пачатковай адукацыі. Менавіта з царкоўных і манастырскіх школ выйшла большасць сярэдневяковых філосафаў. Тым больш, што царкоўная адукацыя ў значнай меры была пазбаўлена саслоўных бар’ераў. Таленавітым прадстаўнікам незаможных пластоў шлях да ведаў у большасці выпадкаў быў адкрыты толькі праз царкоўную адукацыю. Шмат для фарміравання кола ведаў, неабходных сярэдневяковаму чалавеку, зрабіў рымлянін Баэцый, які служыў пры Тэадорыху Астгоцкім і пасля быў названы айцом схаластыкі.

Значнай была роля царквы ў развіцці сярэдневяковай архітэктуры і выяўленчага мастацтва. Першапачаткова ўсе буйны́я каменныя пабудовы рабіліся і ўпрыгожваліся на заказ царквы, за яе кошт. Дваякая была палітычная роля царквы. У Раннім сярэднявеччы яна, зацікаўленая ў трывалай дзяржаўнай уладзе, выступала супраць усобіц і самавольства неўтаймаваных феадалаў. Царква таксама шмат у чым спрыяла стрымліванню і выкараненню першабытных інстынктаў і звычак у паводзінах людзей, стымулявала стварэнне манагамнай сям’і, хоць імкнулася заглушыць у людзях пачуццёвыя памкненні і насаджала шмат якія нормы, што абмяжоўвалі свабоду чалавека.

Дакажыце, што хрысціянства і дзеячы царквы адыгралі важную ролю ў перадачы традыцый антычнай цывілізацыі, у развіцці культуры сярэдневяковага грамадства.

Калі язычніцтва рэгулявала адносіны чалавека з прыродным асяроддзем, дык хрысціянства рэгулявала сацыяльныя адносіны. У адрозненне ад язычніцтва, у якім асоба растваралася ў калектыве, у хрысціянстве ўжо ёсць індывід з пэўнай доляй адказнасці за свае паводзіны. Такім чынам, хрысціянства стала найважнейшым элементам духоўнай культуры еўрапейскага Сярэднявечча.

**6. Канфесіі на тэрыторыі Беларусі.** Да прыняцця хрысціянства на тэрыторыі Беларусі панавалі язычніцкія вераванні. Язычніцтва было політэістычнае і грунтавалася на пакланенні мноству багоў, звязаных з прыродай, урадлівасцю і жыццёвымі цыкламі.

Асноўныя боствы, такія як Пярун, Вялес і Макош, займалі цэнтральнае месца ў культуры і паўсядзённым жыцці старажытных славян.

Сітуацыя пачала змяняцца ў IX ст., калі на тэрыторыю Беларусі сталі пранікаць ідэі хрысціянства. Важным момантам было хрышчэнне княгіні Вольгі ў 955 г., што азнаменавала пачатак хрысціянізацыі славянскіх плямёнаў. Хоць Вольга сама была княгіняй Кіеўскай Русі, яе ўплыў пашырыўся і на беларускія землі.

Правядзіце дэбаты на тэму «Уплыў прыняцця хрысціянства на развіццё беларускай культуры».

Аднак масавае прыняцце хрысціянства адбылося пазней, у канцы X — пачатку XI ст., пасля таго як князь Уладзімір Святаславіч хрысціў Кіеўскую Русь у 988 г. Гэтая падзея значна паўплывала на рэлігійную карту ўсёй усходнеславянскай тэрыторыі. Хрысціянства стала асноўным веравызнаннем сярод кіруючай эліты і паступова пачало пашырацца сярод простага народу.

**7. Рэлігіі Амерыкі і Афрыкі.** У Сярэднія вякі на афрыканскім кантыненце былі пашыраны іслам і хрысціянства. Аднак народы Афрыкі, як і Амерыкі, прытрымліваліся сваіх мясцовых вераванняў. Асабліва папулярны сярод афрыканскіх народаў быў культ продкаў, а таксама абагаўляліся жывыя правадыры, якія надзяляліся звышнатуральнымі здольнасцямі.

Складаныя і разнастайныя былі рэлігійныя вераванні ў сярэдневяковых цывілізацыях Амерыкі. Тут пакланяліся багам, якія ўвасаблялі нябесныя свяцілы, абагаўлялі прыродныя стыхіі. Інкі, напрыклад, галоўным богам лічылі Сонца, чыім сынам лічыўся правадыр. Таксама Сонцу пакланяліся майя, якія верылі, што іх чалавечыя ахвярапрынашэнні дапамагаюць рухацца нябеснаму свяцілу.

Ацтэкі верылі ў тое, што развіццё сусвету адбываецца цыкламі. Канец кожнага цыкла (крыху больш за 50 гадоў) суправаджаецца катастрофамі і бедствамі. Пазбегнуць сусветнай катастрофы і гібелі Сусвету, лі-

чылі ацтэкі, можна толькі шляхам пастаяннага прынашэння багам чалавечых ахвяр.

Рэлігійныя вераванні афрыканскіх і амерыканскіх народаў у Сярэднявеччы абслугоўвала жрэцтва. Гэта была вельмі ўплывовая праслойка грамадства. Жрацы кантралявалі духоўнае жыццё насельніцтва, здзяйснялі абрады і варажэнні, прадказвалі надвор'е, лекавалі хворых.



*Камень Сонца — адзін з найстарэйшых помнікаў ацтэкскай культуры. Мехіка*

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, растлумачце, чаму Камень Сонца — гэта спалучэнне мастацтва, рэлігіі і астраноміі ў адным шэдэўры.